УДК 1 (476) (091) + 2 (476)

# СПЕЦЫФІКА СУЧАСНЫХ ДЗЯРЖАЎНА-КАНФЕСІЙНЫХ І МІЖКАНФЕСІЙНЫХ АДНОСІН У ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Г. І. Мелішак*** (МДУ імя Куляшова)
навук. кір. ***В. У. Старасценка****,*
канд. філас. навук

Дзяржаўна-канфесійныя і міжканфесійныя адносіны ў Гродзенскай вобласці лічацца стабільнымі. На сенняшні дзень у вобласці афіцыйна зарэгістравана 520 рэлігійных арганізацый 16 канфесій. Паводле дадзеных сацыялогіі, 69,8% апытаных ў рэгіене назвалі сябе вернікамі, 56,6% з іх – праваслаўныя, 30,8% – каталікі, 0,4% – пратэстанты [1].

Спецыфікай рэгіена з’яўляецца традыцыйна высокая доля рыма-каталіцкай царквы, што адагрывае сваю ролю ў міжканфесійных адносінах. Так, у 1990-я гады, у перыяд г. зв. “рэлігійна-царкоўнага рэнесансу”, на тэрыторыі вобласці меліся некаторыя спрэчкі наконт будынкаў храмаў, на якія прэтэндавалі як каталікі, так і праваслаўныя.

Больш прыкладаў канструктыўных узаемаадносін. Напрыклад, у сакавіку – маі 2019 г. рэлігійныя арганізацыі БПЦ, РКЦ, ХВЕ і ЕХБ прынялі ўдзел у абласной дабрачыннай акцыі па зборы сродкаў для дзяцей-інвалідаў «Анел у тваім сэрцы».

На сенняшні дзень органы выканаўчай улады Гродзенскай вобласці выконваюць свае абавязкі па падтрыманню міжканфесійнага міра. Рэалізуецца “Праграма развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2021-2025 гады", ідзе актыўнае супрацоўніцтва з канфесіямі, найперш за ўсе з БПЦ. У вобласці рэалізуецца падпісанае 12 чэрвеня 2003 г. "Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і БПЦ", яго прыярытэтныя напрамкі – патрыятычнае выхаванне, духоўная адукацыя, культура і творчая дзейнасць. Штогод праходзяць сустрэчы кіраўніцтва органаў выканаўчай улады з духавенствам.

Міжканфесійныя і дзяржаўна-канфесійныя адносіны ў Гродзенскай вобласці можна ахарактэрызаваць як стабільныя, органы ўлады прымаюць удзел у рэгуляванні міжканфесійных адносін і вырашэнні спрэчак, улічваючы рэлігійную спецыфіку дадзенага заходняга рэгіена і абапіраючыся на асаблівую ролю БПЦ.

**Літаратура**

1. Гродненщина этноконфессиальная [Электронный ресурс] // Официальный портал Гродненского областного исполнительного комитета. – Режим доступа: https://grodno-region.gov.by/ru/konfes-ru/. – Дата доступа: 25.03.2025.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова